**ПАТРЫЯТЫЧНЫ ЗЛЁТ**

# «ХТО, КАЛІ НЕ МЫ!»

***Пад такой назвай напрыканцы лістапада на базе ВДУ прайшо  першы абласны патрыятычны злёт, які сабра  прадста ніко  грамадскіх аб'яднання  і патрыятычных клуба .***

Усё пачалося з акцыі «Памяць сэрца» каля памятнага знака «Ордэн Перамогі», дзе прысутныя ўшанавалі памяць загінуўшых мінутай маўчання і ўсклалі кветкі да манумента. Студэнтка 2 курса ФГіМК Аліна Хрыпач прачытала аўтарскі верш «Вітаю, дзядуля», які напісала Ганна Пятровіч, навучэнка Варапаеўскай сярэдняй школы Пастаўскага раёна.

Урачыстае адкрыццё злёту адбылося ў актавай зале ВДУ. Выпускніца нашага ўніверсітэта, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Марына Навіцкая адзначыла, што пачуццё патрыятызму аб'ядноўвае не адно пакаленне:

– Мы любім нашу родную Беларусь, ганарымся ёй  і робім усё, каб яна заставалася самым дарагім месцам на зямлі. Кожны з нас павінен памятаць мінулае, гаварыць аб сучасным, спадзявацца на будучыню і, вядома, шанаваць тое, што маем.



З прывітальным словам выступіла рэктар Валянціна Багатырова, доктар эканамічных навук, прафесар:

– Выхаваннем сапраўдных патрыётаў займаюцца педагогі. Прыемна, што падмурак нашага ўніверсітэта – настаўніцкая прафесія. Менавіта мы вучым сапраўдных патрыётаў. Гонар і жаданне захаваць гістарычную праўду, каб сфарміраваць шчаслівую будучыню – гэта і ёсць сапраўдны патрыятызм.

– Я ўпэўнена ў неабходнасці і важнасці падтрымкі патрыятычных ініцыятыў. У нас ёсць каштоўнасці, якія аб'ядноўваюць пакаленні, – гэта імкненне вывучаць гісторыю і не дазваляць перапісваць яе, а таксама гатоўнасць дзейнічаць так, каб Радзіма станавілася мацней, а жыццё кожнага грамадзяніна было дастойным, – адзначыла старшыня Віцебскай абласной арганізацыі РГА «Патрыёты Беларусі» Вольга Мацюсь.

Затым ваенны камісар Віцебскай вобласці, падпалкоўнік Руслан Шкодзін выступіў з дакладам пра ваенна-палітычную сітуацыю вакол Беларусі і ўнутры краіны.

Праграма злёту была насычаная. Жадаючыя маглі прыняць удзел у  фестывалі патрыётаў, інтэлектуальнай гульні, прысвечанай Году гістарычнай памяці, а таксама наведаць прэзентацыю паспяховых практык грамадскіх аб'яднанняў па патрыятычным выхаванні насельніцтва.

Завяршыўся злёт святочным канцэртам, у якім прынялі ўдзел у тым ліку творчыя калектывы ВДУ.

Трэба адзначыць, што гэтае мерапрыемства не толькі дазволіла знайсці сяброў-аднадумцаў, але і дапамагло навучэнцам школ горада і вобласці бліжэй пазнаёміцца з нашым універсітэтам. У выніку многія хлопцы і дзяўчаты былі ў захапленні ад атмасферы, што тут пануе, і паабяцалі, што зробяць правільны выбар і стануць студэнтамі ВДУ імя П.М. Машэрава.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Здымак Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**